УДК 811.1.3’367.622’366.542’366.533

К.Д. Ганчарэнка, канд. філал. навук (Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, г. Мінск)

# УЖЫВАННЕ НАЗОЎНІКАЎ МУЖЧЫНСКАГА І НІЯКАГА РОДУ Ў РОДНЫМ СКЛОНЕ МНОЖНАГА ЛІКУ

Скланенне назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду ў Р. скл. мн. л. не ўяўляе вялікай складанасці. Аднак ёсць словы, якія традыцыйна маюць варыянтныя канчаткі.

Звычайна назоўнікі мужчынскага роду з цвёрдай асновай маюць канчаткі *-оў* або *-аў* у залежнасці ад націску. Пад націскам: *сталоў, мячоў, жыхароў*, *прадаўцоў*, *шнуркоў*, не пад націскам – *-аў: заводаў, матываў, хлопцаў*, *школьнікаў*, *геолагаў*. Напр.: *разлілася вышэй **берагоў***, *абараняць **ігракоў***, *дзясяткі **кіламетраў***, *віншаванні для **настаўнікаў***. Назоўнікі з мяккай асновай маюць пад націскам канчатак *-ёў*: *кавалёў*, *кулёў*, *рублёў*, *гаёў*, не пад націскам – *-яў*: *ясеняў*, *прыяцеляў*, *трамваяў*. Напр.: *сем **рублёў***, *алегарычныя вобразы **герояў***, *нумарныя знакі **аўтамабіляў***, *на працягу двух **тыдняў***. Назоўнікі *цень*, *медаль*, *шынель*, якія ў беларускай мове мужчынскага роду, набудуць формы *ценяў*, *медалёў, шынялёў*.

Толькі нулявы канчатак ў Р. скл. мн. л. маюць назоўнікі *чалавек*, *дзень*. *І наўрад ці стрываць // без тых **дзён** і начэй* (А. Зэкаў, Маладосць. № 9. 2015, с. 89); *7 млрд **чалавек** насельніцтва планеты дасягнула ў 2011 годзе* (racyja.com/hramadstva, 29.12.2017). Дадзенае правіла абазначылася яшчэ ў граматыках Б. Тарашкевіча, Я. Лёсіка, А. Багдановіча. Натуральнай для беларускай сістэмы скланення з’яўляюцца формы Р. скл. мн. л. з нулявым канчаткам назоўнікаў, якія абазначаюць людзей паводле месца жыхарства і сацыяльнага статусу з суфіксамі *-анін (-янін)*, *-ын*. Уплыў сістэмы рускай мовы толькі замацаваў гэту форму: *грамадзян, мінчан, гамяльчан, сялян, армян, цыган* і з выпадзеннем суфікса: *балгар*, *татар*, *румын* (*-ын* – частка кораня), а таксама *салдат* і *партызан*. *Беларускія гандбалісты выйгралі ў **румын** на юніёрскім чэмпіянаце Еўропы* (zviazda.by/be/news, 21.08.2014).

Для назоўніка *год* Г.У. Арашонкава рэкамендавала нулявы канчатак для значэння колькасці, для спалучэнняў з парадкавымі лічэбнікамі і пры абазначэнні прыблізнай колькасці – *-оў* [1, с. 70]. У сучасным дыскурсе другі пункт выконваецца: *Мая мама атрымала кватэру на вуліцы Бірузова ў пачатку 60-х **гадоў*** (naviny.by, 23.09.2017); *Мы тут жывем ужо **гадоў** <u>дваццаць</u>* (belsat.eu/in-focus, 12.01.2018). Варыянтнасць – у значэнні колькасці: *Давай ім фальклор,*

*як дваццаць **гадоў** назад* (Я. Хвалей, Прынцэса з тусоўкі. 2000, с. 20); *Навуму Гальпяровічу спаўняецца 70 **гадоў*** (zviazda.by, 13.01.2018), але *Пяцьдзясят сем **год** сумеснага жыцця!* (Ашмянскі Веснік, osh.by/?p=24067, 30.08.2016).

Маюць канчатак *-ей* назоўнікі *госць*, *конь*, *лапаць*, *локаць*, *сусед*, *чорт*, якія ў ходзе развіцця беларускай мовы аказаліся па-за межамі тыповага скланення: *гасцей*, *коней*, *лапцей*, *лакцей*. *Якім трукам вучаць **коней** у цырку?* (zviazda.by/be/news/20161102). Аднак часам мы можам сустрэць у газетных тэкстах форму *суседзяў*.

У назоўніках ніякага роду ў Р. скл. мн. л. пераважае фармальна выражаны канчатак, але ёсць адзінкі, дзе ідзе выбар паміж *-аў (-яў)* і нулявым [2, с. 145]. З канчаткам *-аў* ужываюцца: а) назоўнікі, аснова якіх заканчваецца больш чым на два зычныя: *мерапрыемстваў*, *агенцтваў*; б) назоўнікі, аснова якіх заканчваецца падоўжанымі зычнымі: *узвышшаў, ружжаў*, *абліччаў*; в) назоўнікі, аснова якіх заканчваецца збегам зычных у камбінацыі са звонкім зычным: *сцёблаў*, *дуплаў*, *стойлаў*, *горлаў*, *сцёгнаў*, *рэбраў*, або са свісцячым/ шыпячым: *гнёздаў*, *балотцаў*, *дрэўцаў*, *сэрцаў*, *месцаў*, *прозвішчаў*, *паселішчаў*. *За дзвярыма была невялікая зала <…>, дзе стаялі дзве шырокія канапы*, *пяць **крэслаў** і столік...* (К. Стаселька, Дзіцячы маніфест. 2015, с. 33); г) двухскладовыя назоўнікі з асновай на *л* і націскам на аснове: *джа΄ла – джа΄лаў*, *ду΄ла – ду΄лаў*, *ко΄ла – ко΄лаў*, *шы΄ла – шы΄лаў*, а таксама назоўнік *ло΄жа*, *ве΄ча*, *мо΄ра*, *пу΄за*: *ве΄чаў*, *ло΄жаў*, *мо΄раў*, *пу΄заў*; д) назоўнікі з асновай на адзін зычны і націскам на канчатку ў Н. скл. адз. л.: *звяно΄ – звёнаў*, *крыло΄ – крылаў*, *лязо΄ – лёзаў*, *сяло΄ – сёлаў* (але *сёл/ -аў*). З поўным канчаткам ужываюцца назоўнікі на *в*: *брыво – броваў*, *зарыва – зарываў*, *тулава – тулаваў* (але *дрэў/ дрэваў*). Назоўнік *воблака* можа мець фанетычную варыянтнасць: *воблакаў* і *аблокаў*.

Канчатак *-оў (-ёў)* маюць нешматлікія словы: *дноў*, *швоў*, *палёў*. Адзінкавымі формамі выступаюць *вачэй*, *вушэй*, *плячэй*. Канчатак *-яў* маюць назоўнікі з двума мяккімі зычнымі ў канцы асновы і з асновай “зычны плюс *j*”: *вусцяў, пачуццяў*, *выпрабаванняў*, *вяселляў*, *сузор’яў*, *коп’яў*: *больш за 200 **найменняў** прадукцыі*, *за ўсю гісторыю **метэаназіранняў***.

У некаторых назоўніках ніякага роду сфарміравалася варыянтнасць нулявога канчатка і *-аў*. Гэта назоўнікі, якія маюць аснову на адзіны зычны: *азёр/ -аў*, *балот/ -аў*, *пален/ -аў*, *павек/ -аў, яблык/ -аў*. Назоўнікі, дзе магчыма паяўленне беглага галоснага ў аснове на *др, тн, сл, с’м, кн*: *вёдраў/ вёдзер*, *ядраў/ ядзер*, *палотнаў/*

*палоцен*, *валокнаў/ валокан*, *вокнаў/ вокан (акон)*, *пісьмаў/ пісем*, *вёслаў/ вёсел*, *чыслаў/ чысел*, а таксама *войск/ войскаў*, *валёнкаў/ валёнак*. Напрыклад, *…Забінтаваны вераснёўскі дол, што да вясковых прытуліўся* ***вокан*** (Л. Галубовіч. Вершы з гэтага свету, 2012), але *Калі ўжо казаць пра вытворцаў новых* ***вокнаў****...* (zviazda.by, 08.07.2016).

Некаторыя назоўнікі ўтвараюць зборныя найменні, але зборныя назоўнікі маюць толькі адзіночны лік: *пяро – пёраў*, *пер'е – падушка з пер'я, бервяно – бярвён* і *бярвёнаў*, *бярвенне –* з *бярвення*, *ліст – лістоў*, *лісце – з лісця дрэў.*

ЛІТАРАТУРА

1. Арашонкава, Г.У. Да пытання аб некаторых склонавых формах назоўніка // Сучасная беларуская мова. Пытанні культуры мовы. Мінск, 1973.

2. Кароткая граматыка беларускай мовы: [у 2 ч.] / навук. рэд. А.А. Лукашанец. Мінск. Беларус. навука, 2007. Ч. 1.

УДК 811.161.1:81'243'373

О.В. Ракович, преп. (БГТУ, г. Минск)

## СПОСОБЫ СЕМАНТИЗАЦИИ СЛОВ ПРИ ИЗУЧЕНИИ ЛЕКСИКИ НА ЗАНЯТИЯХ ПО РКИ

При обучении русскому языку как иностранному (РКИ) изучение лексики занимает одно из самых важных мест, так как именно лексика взаимодействует в речи с грамматикой, фонетикой, является ведущим средством речевого общения в устной и письменной формах.

Существует несколько критериев отбора лексических единиц: 1) семантическая ценность слова и нужность слова для общения; 2) частотность употребления слова; 3) ситуативно-тематическая отнесённость слова; 4) способность слова сочетаться с другими словами; 5) словообразовательные возможности слова; 6) учебно-методическая целесообразность введения слова.

С учетом этих критериев создаются лексические минимумы, которые включают максимальное количество слов, необходимых для усвоения в рамках определённого количества учебных часов. Традиционно в современной методике преподавания РКИ выделяют следующие этапы работы с новым лексическим материалом: 1) презентация вводимой лексики; 2) методические действия и прие-